MINI-MAX

USSR Minsk BOX-100

№1 кошт 40к.

# БАБРУЙСКІ КУР'ЕР

Сярод загадаў, чужых, нялюдзкіх
Дзе права жыць нам даюць, як ласку,
Стукоча сэрца па-беларуску,
І сэрцу цяжка.

Вабяць настырна касмічным дзівам,
Сеюць нагрозай сполахі ночы.
Слухаць іх баяў, брудных, ілжывых,
Сэрца ня хоча.

Ад ніў, абманам забраных ў няволю,
За мову продкаў, што хсчуць сьцерці,
Па-беларуску нясьцерпным болем
[К]рывавіць сэрца.

Насупраць родных, насупраць брацьцяў,
Гэтай варожай ласцы-няласцы
У беларускай сялянскай хаце
Сэрца не здасца

Ад сіл варожых ў краі аж гразка,
Народ зьняволіць, аднак, ня проста!
Стукочуць сэрцы па-беларуску
Крывавай помстай

* * *

Адзінай мэты не зрачыся,
І сэрца хай не задрыжыць!
Як жыць, дык жыць для Беларусі
А бязь не зусім ня жыць

Ларыса Геніюш



Modern History Archives
Archiv Nejnovější Historie
Fond 1/11 spravu 812

Відавочна, што Бабруйск, як горад правінцыйны, знаходзіцца ў баку ад "вя-
лікіх спраў. Больш таго, грамадзка-палітычны патэнцыял горада ніжэй, чым у
некаторых мястох значна меньшых памерамі за яго. Тлумачэньне тут у тым,
што ў месьце адносна добрыя сацыяльна-эканамічныя абставіны. Нажаль, вя-
лікая частка грамадзкасьці не адрозьніваецца актыўнасьцю у гэтым пляне,
і, толькі даходзячы да адчаю, жадае ўмомант, стыхійна ды груба вырашыць
набалелыя за шмат гадоў праблемы. Аб першым нефармальным гурце у Бабруй-
ску ўчулі летам 1989 года, у той час, калі ў іншых гарадох ужо дзейнічалі
Рады БНФ, арганізацыйныя структуры іншых палітычных плыняў. Гэтая група
Н.Якімавай, увайшоўшая у БНФ, як гурт падтрымкі, зьвяла сваю дзейнасьць да
тэндэнцыйнай барацьбы з партапаратам, да барацьбы марнай і неперспектыў-
най. Дзесьці ў восень 1989 года зьявілася суполка на БШК, зьяднаўшая ў
сябе сяброў РСБ ды саюзу "Чарнобыль"-плыняў БНФ. Праз некаторы час яны
сфарміравалі Гарадзкі Клюб Выбаршчыкаў, які неўзабаве пачаў зьбірацца ў
школе №20. Сама па сабе структура ГКВ /яны маюцца ўжо ў шмат якіх мястох
зьяўляецца сеньня вельмі пэрспэктыўнай. Гэта ёсьць новы тып сувязі паміж
выбаршчыкамі й дэпутатамі/ніжэй гл. Статут ГКВ/Відавочна, бальшавікі не
жадаюць такой арганізацыі, таму яна дагэтуль не зарэгістраваная. Першай
акцыяй ГКВ было правядзеньне 26 красавіка паніхіды на беразе ракі. Вяс-
ной 1990 года ў гарадзкім Доме Культуры быў зарэгістраваны й пачаў зь-
бірацца гісторыка-асьветніцкі клюб "Гоман". Мэта дзейнасьці клюба-ад-
раджэньне нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў. 25 сакавіка сябры клюба
адзначылі угодкі БНР акцыяй "Дзень Волі. Дрэва незалежнасьці"Трэба да-
даць, што аўтарам гэтага мерапрыемства, якое прайшло і ў Менску, і ў ін-
шых мястох, ёсьць Ігар Куталоўскі - жыхар Бабруйска. Клюб "Гоман" браў
удзел з ГКВ у арганізацыі грамадзкае паніхіды па ахвярах Чарнобыля.
Прайшоўшыя выбары паказалі слабасьць мясцовых некамуністычных сілаў.

Вось такія падзеі адбыліся ў горадзе. Вось у гэтай атмасфэры й нара-
дзілася нашая суполка. Мэта ейнае дзейнасьці - спрыяньне росту нацыя-
нальнай і грамадзкай сьвядомасьці людзей, і, перш за усё, моладзі. Суполка
за дэмакратычныя зьмены не праз новыя рэвалюцыі, а праз узвышэньне па-
літычнае сьвядомасьці людзей. Гэтаму й павінна спрыяць нашае выданьне--
газэта "Бабруйскі кур'ер". Нашая газэта мусіць стаць трыбунай незалежн-
ае думкі. Мы чакаем зьвестак ад чытачоў - іх актыўнасьць для нас га-
лоўнае. Нашая газэта будзе мець два напрамкі, блізкія большасьці сама-
сьвядомага грамадзтва - нацыянальна-адраджэнцкі ды антыкамуністычны
/увогуле - антытаталітарны кірунак/. Газэта дасьць слова і сябрам КПСС
і УЛКСМ, бо яна мусіць быць гарадзкая, альбо народная. Але ніводнага сло-
ва камуністычным прамовам ды заклікам усіх іншых таталітарыстаў, бо яны
заклікаюць да зьнішчэньня народу. Скажам "Жыве Беларусь" і няхай дзеля
гэтага будуць усе нашыя намаганьні.

А.Красавін

# -СТАТУТ-

## БАБРУЙСКАГА ГАРАДЗКОГА КЛЮБА ВЫБАРШЧЫКАЎ

Зацьверджана на устаноўчым сходзе, які адбыўся
3 красавіка 1990г.
Уладамі ня зарэгістраваны.

### 1. УВОДЗІНЫ.

1. Гарадзкі клюб выбаршчыкаў зьяўляецца дабраахвотнай грамадзкай аргані-
зацыяй, аб'яднаўшай жыхароў места, прадстаўнікоў працоўных калектываў і
установ, грамадзкіх арганізацыяў, вайсковых частак, нефармальных рухаў да
аб'яднаньняў дэпутатаў і дзейнічае у рамках канстытуцыі СССР і БССР
2. Дзейнасьць клюбу здзяйсьняецца ў шчыльным кантакце з органамі дзяр-
жаўнае ўлады й грамадзкімі арганізацыямі, працоўнымі калектывамі.
на грамадзкіх пачатках.
3. Клюб ствараецца й дзейнічае на грамадзкіх пачатках.
4. Статут клюбу зацьвярджваецца гарадзкім Саветам народных дэпутатаў.

### 2. МЭТЫ Й ЗАДАЧЫ.

1. Прапаганда й тлумачэньне жыхарам горада законаў аб выбарах народных

ПР. НА Б. 6

# свабодная трыбуна

На фоне трауліі "нефармалаў" адбыўся захоп улады партыйнымі функцыянерамі бадай ва ўсіх мястох нашае краіны. Да улады прыйшлі тыя, хто прывёў да развалу беларускую эканоміку. Што мае быць вынікам выбараў у нашым месьце?

У выніку антызаконнай /гл. газэту "Літаратура і Мастацтва" 29.06.90/ дзейнасьці на выбарах усё камуністычнае кіраўніцтва Бабруйска стала "нашым прадстаўніком" у гарадзкіх Саветах, прычым заняла там адказныя пасады. Першы сакратар гаркаму КПБ В.Алімбачкаў стаў старшынёю гарадзкога Савета, другі сакратар райкаму - Ленінскага Савету, заведуючы ідэалягічнага аддзела райкаму - Першамайскага Савету. Адзначу, што прайшло ўжо некалькі месяцаў пасьля іх "выбраньня", а яны усё яшчэ ня могуць адмовіцца ад сваіх пасад ў партыйных органах. Пэўне, т.Алімбачкаву вельмі хацелася прысутнічаць на 28 зьезде КПСС у сваей пасадзе, што ён забыўся аб сваім абяцаньні скласьці із сябе паўнамоцтвы на бліжэйшым пленуме гаркаму партыі. Прайшло ужо 2 пленумы й гарадзкая партыйная канфэрэнцыя, а т.Алімбачкаў робіць выгляд, што нічога ня здарылася. Працягваючы гэтую тэму, адзначу, што зараз у гарадзкі прэзідыум Савета ўваходзяць былыя першы ды другі сакратары Ленінскага РК КПБ т.т.Бандарэнка й Агур, а таксама старшыня мясцовага райвыканкаму, таму ня выпадкова, што 2 сэсія была сьвядома непадрыхтавана. Дэпутатам не было выдадзена аніякіх працоўных матэр'ялаў, з-за чаго шмат дэпутатаў не мелі здольнасьцяў разважаць. Потым, цэлую гадзіну дэпутаты з залі пераконвалі прэзідыум не прымаць дакумэнта аб абмяжаваньні правоў уласьніка пры набыцьці дзяржаўнае кватэры. Прэзідыум жадаў, каб пасьля сваякоў па прамой лініі права набыць кватэру ў чалавека меў толькі гарвыканкам. Дайшло да таго, што т.Бандарэнка, які й не меў спадзяванкі, што з яго прамовамі могуць назгаджацца, паставіў зале ультыматум: "альбо вы прымаеце такое рашэньне, альбо я ня буду гандляваць дзяржаўнымі кватэрамі". Добра, што усёж заля дала адпор прамовам сваіх "супрацоўнікаў".

Дэкляруючы на словах ідэю супрацоўніцтва з усімі сіламі грамадзтва, партапарат на справе ўсё робіць дзеля таго, каб застацца ля ўлады. Напрыклад, дагэтуль не зарэгістраваны клюб выбаршчыкаў, бо ён мусіць стаць рэальнаю сілаю. Наша грамадзкая актыўнасьць, наша прававая культура -- вось дзе выйсьце з крызісу, да якога нас вяла усе 70 гадоў КПСС.

Чалавек, які даў нам гэтыя матарыялы,
прасіў не вызначаць сябе.
Заўважым толькі, што ён працуе юрыстам

А.Трусаў.

Н.Якімава і беларускае Адраджэньне.

Найперш нас цікавіць нацыянальна-адраджэнцкі уплыў, ягоная роля ў грамадзкім жыцьці Бабруйску. З сумам трэба адзначыць, што як і на усей Магілёушчыне, наша Адраджэньне у месьце пакуль не знайшло сілаў, каб кансалідавацца ў моцны рух. Прычына-нізкі культурны узровень, моцная русіфікацыя ды дэнацыяналізацыя насельніцтва. Таксама адмоўна дзейнічае насычанасьць Бабруйска вайскоўцамі, якія толькі узмацняюць русіфікатарскі уплыў, нясуць шкоду старажытнаму дойлідству Бабруйска.

Першай ластаўкай з нефармалаў у месьце зьявіўся гурт, які абьявіў сябе "народным фронтам". Ён узначальўся сп.Якімавай Н. Гурт гэты пачаў актыўную дзейнасьць з восені 1989 г. шэрагам мітынгаў, на якіх выкрываліся бюракратыя й чыноўнікі. Якую (ён прагнеС?) карысьць адраджэньню беларускай нацыі? На маю думку, дзейнасьць гурта падобна на папулісцкую. Гэткая супольнасьць у асноўным расейскамоўная. Нацыянальная сымболіка, на мой погляд, займае у ім як бы бутафорскае мейсца - з мэтай ідэнтыфікаваць лучнасьць зь Беларускім Адраджэньнем. На жаль, вышэйназваны рух даволі звычайны цяпер для нашага краю. Мэтады ягоных дзеячоў часам не зусім маральны - напрыклад, друк ананімных улетак, зьмест якіх кампраматуе асоб-бюракратаў. Як заправіла, ва улетках інфармацыя

ПР. НА Б. 8



Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaj Historyi
Fond ........... Sprava ...........

# ПЕРШЫ НА БЕЛАРУСІ

На Беларусі нарадзілася новая арганізацыя – Згуртаваньне Беларускіх Студэнтаў /ЗБС/. Галоўнай сваёй мэтай ЗБС ставіць абарону студэнцкіх правоў. Першай акцыяй ЗБС стаў збор подпісаў за дэідэалёгізацыю навучаньня, за ўвядзеньне факультатыву "Гісторыя і культура Беларусі"

Адзіны на Беларусі тэхнікум, які падтрымаў акцыю студэнтаў ВНУ – Бабруйскі сельскагаспадарчы. Але вось як разгорталіся падзеі: калі пад лістом паставілі свае подпісы навучэнцы першых 4 групаў, ён трапіў у рукі старшыні парткама тэхнікуму. Спрацавала машына сістэмы! На другі дзень дзьве групы /дзявочыя/ ІІ курса адмовіліся ад іх, склалі нават добра аргумэнтаваны ліст, чаму так зрабілі. Тым жа днём /вось супадзеньне/ адбыўся камсамольскі сход, дзе старшынёй парткаму заява была зачытана і азначана як прыклад для двох астатніх групаў. Але гэтыя групы 2 курса /з іх і пачыналася гэтая справа/ аказаліся больш упартымі і не падпарадкаваліся. Трэба дадаць, што пад лістом паставілі свае подпісы некалькі настаўнікаў. Магчыма, старшыня парткаму меў спадзяванку ў караніі зьнішчыць тэхнікамаўскую фронду, дык жа памыліўся. Адбылося наступнае. 7 ліпеня групы павінны былі ехаць на 14-дзённыя вайсковыя зборы ў Дубаўцы, у іх ліку і група 93-С. За некалькі дзён да пачатку гэтых збораў названая група даслала ЗАВу свайго аддзяленьня ліст наступнага складу: "Дзякуючы палітыцы ураду СССР сьвет стаў унікаць ад "халоднае вайны", ад мілітарызму. Сьвет пераўтвараецца. Аднак атмасфэра нашае навучальнае установы, як і шмат іншых, не адпавядае гэтым пераўтварэньням. Яскравы гэтаму прыклад -- курс пачатковае вайсковае падрыхтоўкі. Гэты прадмет застаўся ў навучальных установах ад часоў міжнароднай напружанасьці. Водгук яго--разнастайныя гульні накшталт "Орлёнок", "Зарница", усялякія вайсковыя зборы -- адзнака мілітарызму. Праз два гады шмат хто з нас мусіць выканаць свой канстытуцыйны абавязак – будзе служыць у Савецкай Арміі. А сёньня мы адмаўляемся ад праходжаньня вайсковых збораў, якія прадстаяць нам пасьля здачы іспытаў." За тыдзень ад тэрмінаў пачатку збораў адміністрацыя тэхнікума даведалася аб "крамоле" й зрабіла адпаведныя захады. У выніку, дзякуючы ахвярнасьці вышэйназванай групы, вайсковыя зборы ня толькі ёй, але й іншым былі заменёныя штодзеннымі паездкамі /замест 14-дзённага жаўнерскага жыцьця ў казармах/. Калі зборы невайскоўаабавязанай моладзі ёсьць парушэньне закону, дык паездкі туды-сюды клясыфікуюцца, як вучэбная практыка, таму навучэнцы вымушаны былі пагадзіцца прыняць удзел ў ёй. У выпадку адмаўленьня ад яе, вучням пагражала пазбаўленьне стыпендыяў.

Уласн. інф.

# СЬВЯТАР ВІКЕНЦІЙ

...У каго страляюць нашыя дзеці, каго рэжуць. каго забіваюць у сваёх гульнях? Яны гуляюць у вайну, але мы ня лічым гэта нечым жахлівым і ня сьпяшаемся да псыхіят. Ці ня з той прычыны, што самі ненармальныя й не заўважаем вакол сябе паталёгіі? Школы з іх адзінае думкай, формай, піянэрская арганізацыя з яе атрыбутыкай, не сутнасьці сваёй ваенізаваныя. Замест таго, каб вывучаць дзяцей быць людзьмі, прышчапляць дабрыню, у гульнях "Зарніца", "Арлянак" іх вучаць ваяваць, бязьлітасна калечачы й руйнуючы юнацкія душы. У старэйшых клясах школаў, вучэльняў ды тэхнікумаў няпоўналетнім прэступна выкладаюць пачатковую вайсковае падрыхтоўку, калі па закону, людзі да 18 год не зьяўляюцца вайсковаабавязанымі. Ці шмат у нас бацькоў, якія б скарысталі свае законныя правы й забаранілі сваім дзецям наведваць заняткі вайсковае падрыхтоўкі? Ці шмат юнакоў, сьвядома байкатаваўшых гэтыя заняткі? Ці не з таго, што мы сур'ёзна хворыя?..

з работы "Адкуль у нас варожасьць і разлад"
пер. з рас. А. Трусава
"Свободное Слово" №16 "90г.

Лічачыся з жыццёвымі патрэбамі, насьпеўшымі сёньня, наша суполка узяла на сябе функцыі аргкамітэту па стварэньню маладзёжнай дэмакратычнай арганізацыі

# НАША СЛОВА

Нацыянальна-адраджэнцкі маладзёжны рух на Беларусі прайшоў за апошні час вялікі шлях. Дзейнасьць такіх згуртаваньняў, як "Сьвітанак", "Талака", "Тутэйшыя" стала добра вядомая нават за мяжой. Стварэньне КБС /Канфэдэрацыі Беларускіх Суполак/ мае быць вынікам 2 Вальнага Сойму, які адбыўся у Вільні 14 - 15 студзеня 1989 г. З гэтага ж сойму пачалася дзейнасьць па стварэньню студэнцкай арганізацыі. Цяпер гэтая арганізацыя /Згуртаваньне Беларускіх Студэнтаў/ створана і бярэ чынны ўдзел у маладзёжным дэмакратычным руху. І сёньня трэба канстатаваць, што сярэднія навучальныя ўстановы застаюцца адным з апошніх аплотаў камуністычнага таталітарызму. Па-ранейшаму застаецца шмат магчымасьцяў пакараць вучня за сьветапогляд, не адпавядаючы сістэме. У сваёй большасьці тутэйшая моладзь зьяўляецца нацыянальна-несьвядомай, з-за адсутнасьці сэнсу жыцця ейная грамадская актыўнасьць знаходзіцца на нізкім узроўні. Але прысьпеў час і сям-там знаходзяцца тыя, што адчулі сябе грамадзянамі суверэннае, дэмакратычнае краіны. Шкада, што гэтыя хлапчукі ды дзяўчынкі мусяць быць паасобку. Бачыць Бог, надыйшла пільная патрэба узьяднацца. Мы й пачынаем гэтую справу.

Старая сістэма, што пакідала чалавеку ролю "вінціка", разбураецца. Наперадзе - свабода. Калі яна прыйдзе ў грамадства, якое не мае здольнасьцяў РАЗВАЖАЦЬ - гэта пагражае хаосам.

Усьвядомім тое, што прававая й палітычная культура, нацыянальная сьвядомасьць, грамадзкая актыўнасьць - гарантыя дэмакратычнага, цывілізаванага грамадства, яго няспыннага прагрэсу.

Зробім атмасфэру навучальных установаў адпаведнай вольнаму развіццю чалавека, а значыць: УЛКСМ -- па-за сьцены навучальных установаў, дэідэалагізацыя дысцыплінаў, уводзіны курсу "Гісторыя й культура Беларусі", адмена курсу НВП, уводзіны курсу паліталёгіі. Наша дзейнасьць - спрыяньне гэтым зьменам.

Прымем актыўны удзел ў агульнагарадзкім грамадзка-палітычным жыцьці. Мы павінны бачыць сёньня тое, што ў мясцовага "штурвала" стаяць людзі, дабра ад дзейнасьці якіх чакаць нельга /гэта тыпова для усей Беларусі/, што места чакае вырашэньня пытаньня з будаўніцтвам жылога раёну на левым беразе, з вайсковым аэрадромам, з фартыцыяй /крэпасьцю/

Упэўненыя, што справа стварэньня маладзёжнае арганізацыі зацікавіць шмат каго. З прапановамі па гэтаму пытаньню зьвяртайцеся па тэл. 2-41-68 /Смірноў Алесь/. Чакаем лістоў з іншых местаў.

Сеньня кожны будзь на сваім мейсцы!

## ІНФАРМАЦЫЯ

Саюз габрэйскай моладзі і студэнтаў арганізуе запіс ў групы навучэньня пачатковага іўрыта.

Тэл.: 64 - 24 - 73 /Менск/

Вы мусіце занатаваць па адрэсе:

220071, Менск - 71 а/я 183

20 - 22 - 27 /Жэня/

наступныя выданьні:

1. Самавучыцель іўрыта "Сучасны іўрыт" з фаназапісам "Алэфбэйт" для дзяцей.
2. Габрэйская нацыянальная кухня.
3. "Атыква" - гімн Ізраіля /плякат/
4. "Іўрыт" - алфавіт /плякат"/
5. Набор паштовак аб Ізраілю.
6. Габрэйскі каляндар 5750

"Мадрыгін"

# -СТАТУТ-

працяг

дэпутатаў Беларускай ССР і мясцовых Саветаў, абагульненьне й распаўсюджваньне новых формаў і мэтадаў вядзеньня перадвыбарчай кампаніі, арганізацыя дапамогі ў правядзеньні сустрэч выбаршчыкаў з кандыдатамі ў народныя дэпутаты й выбранымі дэпутатамі, удзел у кантролю за падрыхтоўкай выбараў і іх правядзеньнем.

2. Дапамога мясцовым Саветам горада ў арганізацыі справаздач дэпутатаў перад насельніцтвам, а таксама ў іншых мерапрыемствах з улікам патрэбнасьцяў выбаршчыкаў.

3. Арганізацыя грамадзкага кантролю за выкананьнем перадвыбарчых праграмаў выбраных дэпутатаў, загадаў, а таксама наступаючых прапаноў і заўваг выбаршчыкаў, здзяйсьненьня па просьбе выбаршчыкаў права пастаноўкі пытаньня перад адпаведным Саветам аб адзыве дэпутатаў, ня спраўдзіўшых даверу выбаршчыкаў.

4. Вывучэньня грамадзкай думкі жыхароў горада па разнастайных пытаньнях палітычнага, сацыяльна-эканамічнага жыцьця й уясеньня гэтых пытаньняў праз дэпутатаў на абмяркаваньне адпаведных органаў дзяржаўнае улады, садзейнічаньне ў правядзеньні гарадзкіх рэфэрэндумаў.

5. Арганізацыя дыскусыяў па праблемах эканамічнага й сацыяльнага разьвіцьця Бабруйска, прыцягваньня шырокага кола насельніцтва к удзельніцтву ў палітычным жыцьці горада.

6. Узаемадзеяньне з гарадзкімі Саветамі народных дэпутатаў, іншымі пастаяннымі камісыямі, дэпутацкімі групамі ў пытаньнях самакіраваньня, вырашэньня сацыяльных праблемаў.

## 3. СЯБРОЎСТВА Ў КЛЮБЕ.

1. Сябрамі клюбу мусяць быць жыхары места, дасягнуўшыя 18 год.
2. Прыём у сябры клюба ўтвараецца шляхам агульнага сходу альбо Саветам клюбу на падставе паданае заявы.
3. Сяброўства ў клюбе мусіць быць скасавана за парушэньне статуту, невыкананьне абавязкаў альбо за учынак, зьняважлівы да званьня сябра клюбу. Рашэньне аб выключэньні прымаецца агульным сходам, ня меней, чым двума трэцямі галасоў удзельнікаў сходу.

## 4. Праўленьне клюбам.

1. Вышэйшым кіраўнічым органам клюбу зьяўляецца агульны сход, што склікаецца не радзей 1 раза ў месяц /першы аўторак 18.30/
2. У перыяд паміж правядзеньнем агульных сходаў клюбам кіруе Савет, які зьбіраецца на агульным сходзе тэрмінам на 1 год.
3. Савет складаецца са старшыні, яго нага намесьніка й 9 сябраў Савету, што абіраюцца прамым адкрытым галасаваньнем

## 5. Мейсцазнаходжаньне клюбу.

1. Выбарчы клюб разьмяркоўваецца ў мясцовым Доме Культуры.
2. Паседжаньні клюбу й Савета могуць праходзіць таксама ў любым іншым памяшканьні пасьля заключэньня кантракта з яго ўласьнікам.

## 6. Спыненьне дзейнасьці клюбу.

1. Дзейнасьць клюбу мусіць быць спынена рашэньнем агульнага сходу.
2. . . . . . . мясцовым Саветам народных дэпутатаў у выпадку парушэньня кан тытуцыі СССР, БССР альбо іншых заканадаўстваў.

па пытаньнях работы й дзейнасьці клюбу
звaніце па нашаму каардынацыйнаму тэлефону.

---

Старшыня Савету ГКВ - М.Дваракоў

яго намесьнік - Ю.Пазьняк /саюз "Чарнобыль"/

13 ліпеня.10 гадзін раніцы.
У Бабруйску пачаў работу
каталіцкі касьцёл /царква/

Ёсьць запавет – зусім ня
новы,
яго Хрыстос не адмяняў:
хай услаўляюць усе мовы
Сьвятое Божае імя.

Алег Бембель

## МАЛІТВЫ

### З Р А Н К У

Да Цябе, Уладыка, Чалавекалюбца, ад сну ўстаўшы прыбягаю й за справы Твае прыймаюся па міласэрдзю Твайму й малюся Табе: дапамажы мне ва ўсякі час і ва ўсякай справе й захавай мяне ад усякага злога ўчынку й д'ябальскай спакусы й уратуй мяне й увядзі ў царства Тваё вечнае, бо Ты ёсьць мой стварыцель і ўсякага дабра прамысьліцель і падацель, на Цябе ўся надзея мая й Табе хвалу ўзнашу цяпер і заўсёды і ў вякі вечныя. Амін.

ПАВАЖАНАЕ ПАНЬСТВА!
Калі хто з Вас ахвочы вывучаць матчыну мову, браць удзел у сьвяткаваньні народных сьвятаў, ведаць гісторыю роднага краю, й увогуле: хто сьвядомы й любіць Беларусь.
ЗАПРАШАЕМ НА ПАСЕДЖАНЬНІ ГІСТОРЫКА – АСЬВЕТНІЦКАГА КЛЮБУ "Г О М А Н"

Паседжаньні ладзім штосуботы а 17.00 па адрэсе: Камсамольская,53 /Гарадзкі Дом Культуры/
Іншымі днямі ладзім талокі, вандроўкі.



дзе лета

# ДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ПАДЛЕТКУ?

Ці чулі вы такі жарт: ...ш быць здаровым, ... загарэўшым? Невя... толькі, што рабіць, ...ы, — сьмяяцца ...е ж і на ...ад- цаўладкаваньня і пісьмовай згоды бацькоў патрабуецца яшчэ і медыцынская даведка аб стане здароўя, а каб яе атрымаць, прыходзіцца прайсці агляд, а гэта справа займае некалькі дзён. Прыхо...

"Камуніст"

Ахвотныя распаўсюжваць газэту "Бабруйскі кур'ер" ды іншыя выданьні могуць зьвяртацца па нашаму каардынацыйнаму тэл. Аплата ў залежнасьці ад колькасьці ды хуткасьці +ахвяраваньні пакупнікоў. Работа на свежым паветры. Медыцынскіх даведак ня трэба.

Паважаныя паны каап'ератары!

Газэта "Бабруйскі кур'ер" зьмясьціць Вашу рэкляму.

Усех, хто ахвочы падпісацца на газэту "Бабруйскі кур'ер", просім зьвяртацца зь лістом па адрэсе: 213802, Бабруйск, вул. Валадарскага, 138, кв.25 спадару Трусаву Аляксею
У лісьце дасылайце, калі ласка, грошы /3 рублі/. Пасля таго, як Вы атрымаеце адпаведную колькасьць газэтаў/у рахунак далучаецца кошт перасылкі–6 кап./ мы паведамім Вам аб яе працягу.

Да таго ж рэдакцыя газэты "Бабруйскі кур'ер" мае магчымасьць дасылаць Вам па Вашых заказах нумары газэт "Свабода", "Навіны БНФ", "Абуджэньне"/Магілёў/, "Студэнцкая думка", "Грунвальд" /Эстонія/, "Звязда"/ЗША/, "Весьнік маталіцкага душпастырства"/Англія/ ды іншыя.

С Я Б Р Ы!

Стаць ці не газэце БАБРУЙСКІ КУР'ЕР гарадской прагрэсіўнай газэтай, форумам незалежнае думкі -- ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ВАС!

Матар'ялы характару грамадска-палітычнага, культуралягічнага, прапановы, абвесткі і інш.
ДАСЫЛАЦЬ: 213819 Бабруйск Энгельса,102, кв.27 Красавіну А.

MINI-MAX

USSR Minsk BOX-100



Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond ........... Sprava ...........

сьціравана на абудженьне ня лепшых пачуцьцяў людзей. Лепшыя пачуцьці – гэта нацыянальная сьвядомасьць, любоў да Беларусі. У іх жа абуджэньне зайдрасьці да людзей апарата. Гэткія мэтады прыводзяць да дрэнных вынікаў. Варта узгадаць гісторыю 70-годнае даўнасьці. Ды й ці варта траціць моц на выкрыцьцё носьбітаў заганнае ідэялёгіі, якая ня сёньня-заўтра адамрэ?

Шлях спадарыні Якімавай мусіць завесьці грамадзтва ў тупік.

Змагаймася, спадары, з маскоўскай экспансыяй: культурнай, эканамічнай, ваеннай.

Жыве Беларусь!

ффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффф

З маніфэста
РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ /знаходзіцца ў эміграцыі/
ад 25 сакавіка 1988 году.

...Дорага заплаціла Беларусь у складзе маскоўскай імпэрыі: сталінскі тэрор – раскулачваньне да пагромы г.зв. нацдэмаў – каштаваў сотні тысячаў ахвяраў людзьмі; хрушчоўска-брэжнеўскі "застой" прывёў да глыбокага крызісу беларускую нацыянальную культуру, да зьнішчэньня сотняў гістарычных помнікаў краю; гарбачоўская публічнасьць /галоснасьць/ карыстаецца тымчасам толькі касмэтыкай, каб прыхаваць усю тую спустошанасьць, да якое давяла Беларусь савецкая нацыянальная палітыка.

Рэагуючы на пошасьць гэтага зьнішчэньня, на эпідэмію дэнацыяналізацыі, узьнялося цяпер на самаабарону маладое пакаленьня беларусаў, якое стыхійным рухам зьнізу, наўсуперак бюракратычным бар'ерам ды інэртнасьці бальшыні грамадзтва, намагаецца павярнуць працэс у адваротны бок – да нацыянальнага адраджэньня. Няхай-жа ў гэтым руху маладых беларусаў, у іхняй дзейнасьці для дабра роднага краю, як і ў працы ўсіх нас на карысьць Беларусі вядзе нас наперад ідэал дэмакратычнай і незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі!

Жыве Беларусь!

Жыве Ідэя Незалежнасьці Беларусі!

Чужына, 25 сакавіка 1988 году.

Прэзідыум рады
Беларускай Народнай Рэспублікі.

"КАНТАКТ" №1

ффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффффф

АД РЭДАКЦЫІ

Зараз многія прагрэсіўныя мовазнаўцы згаджаюцца з тым, што рэформа 1933 году правапісу моцна пашкодзіла беларускай мове, яе галоўнаму прынцыпу: "як чуецца, так і пішацца", таму мы вырашылі прытрымлівацца дарэформавай граматыкі.

Ўвага! Дадатак да газэты "Бабруйскі кур'ер" распаўсюджваецца бясплатна.

тэлефануйце: 2 41 68 Смірноў Алесь

ГАРАДЗКАЯ ГАЗЭТА "Бабруйскі кур'ер"
Выданьне гарадзкой маладзёжнай
групы падтрымкі БНФ

Перадрук дазваляецца толькі
са спасылкай на крыніцу.
Прабачайце за памылкі.

Нумар падрыхтавалі: Алесь Красавін, Аляксей Трусаў ды інш.
Апрацоўка закончана 13.07.90г.
Друкавалася ў Менску. Кошт 40 кап. Тыраж 3000 асобнікаў.